жр 3230

Библиотека АН БССР

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ ЗАХОПНІКАМ!

Прачытаў—перадай другому


# ЗА РАДЗІМУ

Орган Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б

№ 5 (43) | Аўторак 25 красавіка | 1944 г.


**ПАРТЫЯ І СОВЕЦКІ ЎРАД ДАПАМАГАЮЦЬ РАЁНАМ, ВЫЗВАЛЕНЫМ АД НЯМЕЦКІХ ФАШЫСТАЎ. ТОЛЬКІ ПА НАШАЙ ОБЛАСЦІ ЎЖО АДБУДАВАНА ЗВЫШ 2 ТЫСЯЧ ДАМОЎ КАЛГАСНІКАЎ, ВАССТАНОЎЛЕНЫ 915 КАЛГАСАЎ І 23 МТС.**

## ДА ЎСІХ ПАРТЫЗАН І ПАРТЫЗАНАК МАГІЛЕЎСКАЙ ОБЛАСЦІ

### ТАВАРЫШЫ ПАРТЫЗАНЫ І ПАРТЫЗАНКІ!

Магілеўскі абласны Камітэт КП(б) Беларусі з задавальненнем адзначае поспехі нашых слаўных партызан і партызанак, якія сваёй адважнай барацьбой у тылу ворага, не шкадуючы свайго жыцця, гераічна і бязлітасна знішчаюць фашысцкіх варвараў і дапамагаюць нашай гераічнай Чырвонай Арміі разграміць і выгнаць іх з нашай Совецкай зямлі.

Партызанскі рух на Беларусі кожны дзень і час пашыраецца. Пад сцягам адважных народных мсціўцаў яднаюцца каб біцца з ворагам тыя, хто любіць сваю Совецкую Радзіму, хто люта ненавідзіць фашызм і яго „новы парадак“.

Партызаны ў сваіх шэрагах налічваюць сотні тысяч барацьбітоў, якія сталі грознай сілай для ворага. Усякія спробы фашыстаў пашкодзіць гэтаму магутнаму руху разбіваліся і разбіваюцца аб стойкасць адважных барацьбітоў.

Партызанскія атрады, дзейнічаючыя на тэрыторыі нашай абласці, за паўтары—два годы знішчылі звыш 124 тысячы нямецкіх салдат і афіцэраў, звыш 9 тысяч здраднікаў Радзімы і паліцэйскіх, а таксама вялікую колькасць эшалонаў, паравозаў, танкаў і іншай варожай зброі.

Кожны партызанскі атрад адзначаецца сваімі гераічнымі баявымі справамі, дасягнутымі адвагай і храбрасцю яго байцоў і камандзіраў.

Абласны Камітэт КП(б) Беларусі віншуе і шле сваё бальшавіцкае прывітанне ўсім партызанам і партызанкам, камандзірам і палітработнікам атрадаў, дзейнічаючых у тылу ворага на тэрыторыі Магілеўскай абласці.

Амаль паўгода як частка тэрыторыі Совецкай Беларусі вызвалена ад крывавых катаў—нямецка-фашысцкіх акупантаў. Па Магілеўскай абласці фашысты выгнаны поўнасцю з 8-мі і часткова з 4-х раёнаў. Надыходзіць час, калі вораг будзе вытрахнут з усіх раёнаў нашай Совецкай Беларусі. Ужо амаль поўнасцю вызвалена з-пад іга акупантаў наша брацкая Украінская ССР. Вораг, разбіты наступацельным поступам Чырвонай Арміі, уцякае за дзяржаўную мяжу Совецкага Саюза. Вызваленыя гарады, раёны і вёскі зноў пачалі жыць пад сцягам Сталінскай Канстытуцыі ў вялікай сям'і народаў Совецкага Саюза.

Нямецка-фашысцкія варвары нанеслі вялікія страты народнай гаспадарцы нашай абласці. Уцякаючы пад ударамі Чырвонай Арміі, яны не застанаўліваліся ні перад якімі злачынствамі, яны палілі і знішчалі на сваім шляху ўсё што было дасягнута беларускім народам за мірныя годы соцыялістычнага будаўніцтва. Уцякаючы яны знішчылі звыш 100 прадпрыемстваў дзяржаўнай і мясцовай прамысловасці, спалілі 23.995 сялянскіх двароў, каля 5.000 розных калгасных будынкаў, больш 240 сярэдніх і пачатковых школ, амаль усе бальніцы і амбулаторыі. Фашысцкія зверы ў 8 раёнах абласці замучылі і забілі 18.500 чалавек мірнага насельніцтва, сярод якога значная колькасць дзяцей.

Толькі па 8-мі раёнах нашай абласці фашысты нанеслі страт у прамысловасці звыш 40 мільёнаў, у камунальнай гаспадарцы 30,8 мільёнаў рублёў, па культурнаасветных установах на 75 мільёнаў рублёў і ў сельскай гаспадарцы на 670 мільёнаў.

Але зверствы варвараў, імкненні іх разбурыць і зруйнаваць у Беларусі яе нацыянальную культуру, заняволіць народ не зламілі духа і непахіснасці нашых совецкіх людзей.

Зараз ва ўсіх вызваленых ад нямецкіх фашыстаў раёнах працоўныя, пры дапамозе партыі і совецкага Урада, адбудоўваюць разбуранае і шчыра па-бальшэвіцку рашаюць задачу, пастаўленую таварышам СТАЛІНЫМ: „Узняць разбураныя гарады і сёлы, прамысловасць, транспарт, сельскую гаспадарку, культурныя ўстановы, стварыць для совецкіх людзей, пазбаўленых ад фашысцкага рабства, нармальныя ўмовы жыцця“.

За кароткі час пасля вызвалення ў нашай абласці адбудаваны і пачалі дзейнічаць 63 прадпрыемствы, 37 прамысловых арцеляў, якія за 5 месяцаў сваёй працы выпусцілі прадукцыі на 3,5 мільёны рублёў. Ужо адбудаваны, і ў першую чаргу сем'ям франтавікоў і партызан, звыш 2 тысяч дамоў і больш 50 проц. адпушчанага лесу вывезена на месца будоўлі.

Усе 915 калгасаў, якія былі разбураны і разагнаны фашыстамі, зноў пачалі сваю дзейнасць, абралі праўленні і рэвізійныя камісіі з ліку лепшых адданых калгаснаму будаўніцтву калгаснікаў.

Зараз усе калгасы напярэдадні вясенняй сяўбы і сяўбу будуць праводзіць па-бальшэвіцку ў згуртавана калгасных шэрагах. Ужо амаль закончана засыпка насення, рамантуецца інвентар, збруя. 23 машынатрактарныя станцыі распачалі сваю дзейнасць—670 трактароў адрамантаваныя і новазавезеныя з заводаў пачнуць апрацоўваць вызваленыя калгасныя палі.

Каля 60.000 дзяцей вярнуліся ў сваю беларускую школу і

(Працяг на 2 старонцы).

жр 3230



## Да ўсіх партызан і партызанак Магілеўскай вобласці

(Працяг).

вучацца на роднай беларускай мове. Пачалі працаваць сотні бібліятэк, хат-чытален і клубаў.

Увесь савецкі народ аддана працуе над тым, каб дапамагчы нашай Чырвонай Арміі хутчэй знішчыць ворага. За некалькі дзён калгаснае сялянства і працоўныя вобласці сабралі з сваіх асабістых зберажэнняў больш 2,5 мільёнаў рублёў на пабудову танкаў і самалётаў і працягваюць уносіць сродкі на гэту патрыятычную справу.

Вы, таварышы, партызаны і партызанкі, нясеце пачэсную ролю—са зброяй у руках дапамагаеце нашай Чырвонай Арміі хутчэй разграміць ненавіснага ворага.

Вышэй трымайце сцяг барацьбы супроць захопнікаў. Бязлітасна знішчайце нямецкафашысцкіх ублюдкаў, усіх здраднікаў і паліцэйскіх. Не давайце ім уганяць мірнае насельніцтва ў рабства, перашкаджайце падвозу зброі і снаражэння ворага к фронту. Перашкаджайце варварскаму разбурэнню нашых гарадоў і сёл, прадпрыемстваў, культурных устаноў. Не давайце фашысцкім служкам адурманіваць насельніцтва гебельсаўскай брахнёй.

Няхай жыве наша гераічная Чырвоная Армія!

Няхай жывуць нашы адважныя партызаны і партызанкі!

Слава Вялікаму СТАЛІНУ!

Сакратар Магілеўскага абкома КП(б) Беларусі
І. МАКАРАЎ.

31 сакавіка 1944 года.

## Узарвалі варожы танк

Баявымі справамі адказваюць партызаны на зварот беларускага ўрада.

10 красавіка падрыўная група Н-скага атрада пад камандаваннем тав. П—к на шасе Магілеў—Бабруйск узарвала варожы танк і 2 павозкі. Знішчан экіпаж танка і яшчэ 10 гітлераўцаў.

Загадам абкома тав. П—к аб'яўлена падзяка.

С. В.

## Захоплены каштоўныя дакументы

Група партызан Н-скага атрада зрабіла засаду на шасе.

Хутка паказаліся нямецкія аўтамашыны. Смелым налётам партызаны знішчылі дзве аўтамашыны і забілі некалькі фрыцаў, сярод якіх афіцэр.

Захоплены каштоўныя дакументы.

К—р атрада І.

## Прывітанне героям!

23 красавіка сакратар Магілеўскага падпольнага абкома КП(б)Б тав. Ш. уручыў ордэны і медалі групе камандзіраў і партызан Клічаўскага раёна.

Першым атрымлівае ордэн Чырвонага Сцягу камандзір першага ў раёне атрада Ігнат І. Прысутныя горача віншуюць свайго баявога таварыша і камандзіра.

Атрымаўшы ўзнагароду стары партызан Федос М. заявіў:

—Мне звыш 60 год. Я глыбока ўсхвалеван высокай узнагародай. Запэўняю партыю і ўрад, што буду да апошняга дыхання змагацца за сваю Радзіму.

Ордэны і медалі атрымалі 90 чалавек.

У той-жа дзень ордэны і медалі ўручаны партызанам Кіраўскага раёна.

Ордэны Чырвонага Сцягу атрымалі арганізатары атрадаў Сцяпан С., Герасім К., Ігнат Г., ордэн Чырвонай Звязды Анісім Б. і другія байцы і камандзіры.

Бальшавіцкае прывітанне героям, якія ўдастоіліся высокай урадавай узнагароды!

## На франтах Айчыннай вайны

За апошнія дні на франтах істотных змен не адбылося.

У ноч на 24 красавіка наша авіяцыя бамбардыравала скапленні воінскіх эшалонаў на чыгуначным вузле Львоў. Узніклі пажары і ўзрывы.

### ЗА ГРАНІЦАЙ

## Дзеянні авіяцыі саюзнікаў

ЛОНДАН, 24 красавіка. (ТАСС). Як афіцыяльна паведамляецца 300 амерыканскіх бамбардыроўшчыкаў зрабілі ўчора раніцай налёт на ваенныя аб'екты праціўніка на ўзбярэжжы Францыі. Удзень бамбардыроўка гэтых аб'ектаў працягвалася другімі злучэннямі авіяцыі саюзнікаў.

У той-жа дзень амерыканскія самалёты зрабілі налёт на 7 германскіх аэрадромаў.

У ноч на 24 красавіка англійскія бамбардыроўшчыкі зрабілі налёт на склад сродкаў сувязі ў Більвардзе (у 6 мілях ад Бруселя). Самалёты „Москито" зрабілі налёт на Мангейм.

Як перадае агенства Рэйтэр учора ўдзень буйныя злучэнні амерыканскіх цяжкіх бамбардыроўшчыкаў зрабілі налёт на Вінер-Нейштадт. Бамбардыроўцы падвергліся тры авіяцыйных заводы і аэрадром у 17 мілях ад Вены. Адзначана многа прамых трапанняў.

## Здзекі над насельніцтвам

Уварваўшыся ў вёску Брадзец, немцы і іх пасобнікі — здраднікі і паліцэйскія, пагалоўна аграбілі насельніцтва. Забіралі прадукты харчавання, вопратку, дробны гаспадарчы інвентар.

Азвярэлыя гітлераўцы паймалі непаспеўшую схавацца 67-гадовую Аўдоцію Г. і 12-гадовую дзяўчынку Галю і па-звярынаму над імі здзекаваліся—білі палкамі, прыкладамі, ставілі да сцяны і стралялі. Хворую Насцю П. фашысты паднялі і кінулі на падлогу.

11 дзяўчат і 8 мужчын угналі ў гэты дзень фашысты з вёсак Брадзец і Падкамень.

Гарошка.

В. а. адказнага рэдактара
І. КРЫСКАВЕЦ.

Друкарня газеты „За радзіму".